І. А. Дудзік

# ПРЫМЯНЕННЕ МАГДЭБУРГСКАГА ПРАВА Ў Г. БРЭСЦЕ Ў КАНЦЫ XIV–КАНЦЫ XVIII СТСТ.

У перыяд узнікнення і станаўлення Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) кіраванне гарадамі не было уніфікавана. У вялікакняжацкіх гарадах ад імя вялікага князя кіравалі яго службовыя асобы. У гарадах у «землях прыслухаючых» доўгі час захоўваліся старажытныя органы пад кіраўніцтвам мясцовых князёў. Паступова складваўся статус прыватнаўласніцкіх гарадоў.

Актывізацыя эканамічных адносін прывяла да таго, што гарады ўсё больш ператвараліся ў цэнтры рамяства і гандлю, што выклікала неабходнасць рэфармавання органаў кіравання, надання большай самастойнасці самім гарадскім жыхарам. У перыяд узмацнення цэнтралізацыі ў канцы XV ст. і ў XVI ст. некаторыя гарады дабіваліся спецыяльных грамат – магдэбургскага права, т. я. іх ужо не задавальнялі нормы звычаёвага права ў рэгуляванні складаных эканамічных адносін.

Першапачаткова такая сістэма прававых норм была ўведзена ў XII ст. у нямецкім горадзе Магдэбург. У гарадах прадугледжвалася абмежаванне ўлады мясцовых дзяржаўных органаў. Яны атрымалі права мець органы гарадского кіравання ў спалучэнні з некаторымі элементамі самакіравання, адносна самастойную арганізацыю і рэгуляванне рамеснай дзейнасці, замацоўвалася права гараджан на свой уласны гарадскі суд, герб.

На чале гарадской адміністрацыі і суда быў войт, прызначаны ўрадам з ліку феадалаў ці гараджан. Ён сачыў за падтрыманнем парадку ў горадзе, за захаваннем правілаў гандлю, клапаціўся пра абарону інтарэсаў мяшчан перад урадам і ў канфліктах з асобнымі феадаламі, сачыў за своечасовым зборам падаткаў з мяшчан, ажыццяўляў сумесна з членамі гарадской рады і лаўнікамі (намеснікамі) правасуддзе. Войт мог прызначыць сабе намесніка – лентвойта. Памочнікамі войта па кіраванні справамі ў горадзе былі бурмістры, як правіла, два. Бурмістры прызначаліся ці зацвярджаліся войтам з ліку членаў гарадской рады. Бурмістры ў асноўным вырашалі бягучыя справы: пытанні гандлю, рамяства, гарадскога добраўпарадкавання. Яны клапаціліся аб належным утрыманні гарадскіх абарончых пабудоў, нясенні старажавой службы насельніцтвам і выкананні іншых павіннасцей, ажыццяўлялі правасуддзе па дробных справах.

Гарадская рада ў большасці беларускіх гарадоў складалася прыкладна з 6–20 чалавек. У адных гарадах рада выбіралася мяшчанамі, у другіх – сам войт камплектаваў раду. Як правіла, у раду ўваходзілі найбольш багатыя купцы, цэхмістры – кіраўнікі рамесніцкіх цэхаў і багатыя майстры-рамеснікі. Гарадская рада вызначала агульны кірунак развіцця гарадской гаспадаркі, кіравала пытаннямі добраўпарадкавання і падтрыманнем у баявой гатоўнасці абарончых пабудоў, выносіла рашэнні аб зборы з насельніцтва неабходных сродкаў на гарадскія патрэбы, ажыццяўляла контроль над іх расходаваннем, члены гарадской рады ўдзельнічалі ў ажыццяўленні правасуддзя сумесна з войтам ці бурмістрам. Функцыі нізкіх службовых асоб у гарадах па збору падаткаў, кантролю над дзейнасцю гандляроў і рамеснікаў, за падтрыманнем парадку выконвалі соцкія, дзясяцкія і «слугі местскія», якія знаходзіліся ў падпарадкаванні ў войта і бурмістраў.

Магдэбургскае права ўнесла значныя змены ў прававае становішча мяшчан, удакладніла і палепшыла яго. Замест шматлікіх натуральных павіннасцей гараджане плацілі адзін грашовы падатак, памер якога быў дакладна вызначаны. Таксама яны передавалі ў дзяржаўны скарб пазначаную колькасць выробленых рамеснікамі тавараў. Памеры гандлёвага і рамеснага падаткаў умацоўвалі эканамічнае становішча гарадоў і садзейнічали свабоднай эканамічнай дзейнасці [3].

Аднак беларускія гарады не проста ўспрынялі новыя прынцыпы жыццядзейнасці гарадоў і сістэм гарадскіх органаў кіравання, якія былі прыстасаваны да мясцовых умоў і асаблівасцяў. Што датычыць непасрэдна прававых умоў, на аснове якіх будавалася сістэма ўзаемаадносін гараджан у розных грамадскіх сферах, то ў пераважнай большасці з іх знайшлі адлюстраванне мясцовыя звычаі і тыя ўласныя новыя нормы, якія былі распрацаваны ў працэсе развіцця дзяржавы і аддзялення гараджан у адасобленае саслоўе – мяшчан. 15 жніўня 1390 г. сваім прывілеем вялікі князь літоўскі і кароль польскі Уладзіслаў II Ягайла надаў Берасцю магдэбургскае права. Берасце быў першым з беларускіх гарадоў і адным з нямногіх еўрапейскіх, які валодаў прывілеем на самакіраванне. Гэта была знакавая падзея, якая карэнным чынам змяніла далейшую біяграфію горада, ён атрымаў самы прагрэсіўны звод законаў, што рэгулявалі мясцовае жыццё.

Набыццё нямецкага права для горада, па меркаванні аўтарытэтных вучоных XIX ст., якія даследавалі саму сутнасць гэтай формы арганізацыі грамадскіх адносін, азначала:

1. Аслабленне каралеўскай улады і эканамічнага ўплыву караля, спачатку ў Польшчы, затым у ВКЛ. Пазбаўленне яго большай часткі фінансавых правоў.

2. Змена карэнным чынам побыту сельскіх жыхароў. Наданне нямецкага права разбурала сувязь земства з горадам.

3. Узнікненне новага ўяўлення пра горад і гарадское саслоўе.

4. Паступовы пераход ад «удзельнай і натуральнай павінасцей на грашовы аброк – чынш (з валокі – 12 грошаў)». Устанаўлівалася пэўная колькасць павіннасцей у залежнасці ад велічыні надзела.

5. Выплата прамога падатку (паральнага) 2 грошы толькі з апрацоўваемай зямлі, які ў час апрацоўкі не выплачваўся.

6. Надзяленне кожнага валокай (ланом) у вечную ленную уласнасць. Па даледаванні І. А. Ліннічэнка, да нямецкага права дакладна памераных надзелаў не было, землі «рускіх» сялянскіх грамад размяшчаліся ў розных месцах. Са з'яўленнем нямецкага права – у адным кавалку.

7. Увядзенне войтаў і «скабінаў» (лаўнікаў) [2, с. 55].

У граматах, якімі надавалася магдэбургскае права асобным гарадам, казалася, што кароль адмяняе «ўсе іншыя правы польскія, літоўскія і рускія і ўсе іншыя звычаі, якія былі б нязгодныя з правам нямецкім магдэбургскім».

Горад вызваляўся ад улады ваявод, паноў, старостаў, суддзяў і падсудкаў, намеснікаў і іншых чыноўнікаў; гараджане не былі абавязаны адказваць перад іміў чым-небудзь, і хто б на іх не спаслаўся. У гарадах устанаўліваўся свой уласны суд.

Атрымліваючы магдэбургскае права, гораджане ў выпадку вайны выхадзілі абараняць не толькі дзяржаву, але і сваю «гарадскую незалежнасць», свае свабоды. На аснове магдэбургскага права ў горадзе ствараўся выбарны орган самакіравання – магістрат. У той час берасцейцамі былі засвоены многія набыткі Захаду, у тым ліку і арганізацыя жыцця горада на аснове самакіраваня.

У судовай практыцы магістратаў у першай палове XVII ст. сумесна з магдэбургскім правам выкарыстоўваліся нормы агульнадзяржаўнага кодэкса – Статута ВКЛ.

У 1776 г. пастановай Варшаўскага сейма «дробныя» гарады і мястэчкі Рэчы Паспалітай пазбаўляліся магдэбургскага права. Яно было пакінута толькі 11 гарадам, у тым ліку і Брэсту.

Такія меры аргументаваліся тым, што жыхары гарадоў атрымалі магдэбургскае права, «не цікавячыся купецкім заняткам, гандлем і рамяством, няўмела займаюцца земляробствам, а судовыя справы няправільна вырашаюць».

Аднак 18 сакавікаа 1791 г. самакіраванне ў каралеўскіх гарадах было ўзноўлена з яшчэ больш шырокімі правамі, а ў канцы гэтага года яго атрымалі і некаторыя гарады, якія ім раней не карысталіся [1, с. 242].

Магдэбургскае права арганічна ўвайшло ў жыццё гарадоў, бо адбылося развіццё і зліццё даўніх традыцый самакіравання, існаваўшых ў некаторых старажытных гарадах, з нормамі магдэбургскага права.

Устанаўленне самакіравання паляпшала ўмовы рамеснай і гандлёвай дзейнасці, аслабляла феадальную залежнасць гараджан, якія былі асабіста свабоднымі.

Такім чынам, размяшчэнне сучасных беларускіх зямель у цэнтры Еўропы садзейнічала іх развіццю ў рэчышчы сусветнага эканамічнага, палітычнага і культурнага працэсаў. Гарады станавіліся цэнтрамі рамяства і гандлю, вальнадумства і дэмакратычных традыцый. На самай справе арганізацыя жыцця гарадоў не выходзіла за межы феадальнай падпарадкаванасці, але яна была рэвалюцыйнай у плане развіцця вытворчасці, гандлю і абмену. І менавіта магдэбургскае права стала тым пераходным момантам, які падрыхтаваў фундамент для фарміравання новых эканамічных адносін.

### *Спіс літаратуры*


1. Доўнар, А. Магдэбургскае права / А. Доўнар // Вялікае княства Літоўскае : Энцыклапедыя. У 3 т. – Мінск : БелЭН, 2005 – 2010. – Т. 2 : Кадэцкі корпус – Яцкевіч / Рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; маст. З. Э. Герасімовіч. – 2006. – 792 с. – С. 241–242.
2. Никитчик, А. Д. Первая берестейская магдебургия. События и подробности получения и истории / А. Д. Никитчик, Т. А. Никитчик // Вестник Брестского государственного технического университета. – 2011. – № 6. – С. 54–64.
3. Руководство в белорусских городах. Магдебургское право // StufFiles : файловый архив студентов [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://studfile.net/preview/7221706/page:23/. – Дата доступа: 27.02.2026.
4. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Чашніцкага раёна. – Мінск : Беларуская навука, 1997. – 542 с.



*Дудзік Іван Андрэевіч*, студэнт 1 курса ФІТіК БДУІР, dudikivan325@gmail.com

*Навуковы кіраўнік: Мікалаева Людміла Віктараўна*, загадчык кафедры гуманітарных дысцыплін БДУІР, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, Mikalayeva@bsuir.by